**УДК 303.446.4(=161.3)(475.5)“18/20”=161.3**

# ДА ПЫТАННЯ ГІСТАРЫЯГРАФІІ БЕЛАРУСАЎ У ЛІТВЕ Ў ПРАЦАХ ДАСЛЕДЧЫКАЎ КАНЦА XIX – ПАЧАТКУ XXI СТАГОДДЗЯ

***А.М. ІЗЕРГІНА***
***(Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі)***

*Зроблены аналітычны агляд навуковых прац беларускіх, літоўскіх, польскіх гісторыкаў, якія маюць дачыненне да пытання вывучэння беларускай дыяспары ў Літве. Аўтарам выдзелены тры храналагічныя перыяды даследавання тэмы. Для першага перыяду характэрным з’яўляецца назапашванне інфармацыі і атрыманне доказу існавання беларусаў, як асобнага этнасу. Другі перыяд храналагічна супадае з часам існавання савецкай дзяржавы, калі вялікі ўплыў на гістарычную навуку аказвала дзяржаўная сістэма і яе патрабаванні. Трэці перыяд бярэ свой пачатак у другой палове 1980-х гг., калі адбываецца пераасэнсаванне і змяненне палітычнага курсу. Развіццё гістарычнай навукі ў незалежных дзяржавах дало магчымасць больш грунтоўна і змястоўна разгледзець пытанні беларускага замежжа.*

***Ключавыя словы**: дыяспара, этнас, беларускае замежжа.*

Ва ўмовах глабалізацыі сучаснага грамадства асаблівую папулярнасць у розных краінах свету набывае накірунак усебаковага даследавання малых этнічных груп, якія былі ўцягнуты ў кола сацыяльных, эканамічных, палітычных змен у XX – пачатку XXI стст. На тэрыторыі былога Савецкага Саюза са спыненнем існавання гэтай дзяржавы адбываецца вылучэнне малых этнічных груп як асобных сацыяльна-структурных адзінак, у адносінах да якіх ужываецца тэрмін “дыяспара”. Словам “дыяспара” (з грэчаскай мовы – рассяленне) прынята называць сукупнасць пэўнага народа, якая пражывае па-за межамі метраполіі і валодае асноўнымі рысамі нацыянальнай адметнасці народу – мовай, культурай, самасвядомасцю. Тэрмін “беларуская дыяспара” пачаў актыўна ўжывацца ў навуковых даследаваннях і публіцыстыцы адносна нядаўна, атрымаў сваё распаўсюджванне ў беларускай гістарыяграфіі з канца 1980-х гг. [1].

У канцы XIX ст. – 1980-я гг. беларуская дыяспара ахоплівала ад 1/6 да 1/3 часткі беларусаў. У 1990-я гг. па-за межамі Рэспублікі Беларусь пражывала 3–3,5 млн беларусаў. Суполкі эмігрантаў і нашчадкаў эмігрантаў з Беларусі дзейнічаюць у краінах СНД, Балтыі, Аўстраліі, Бельгіі, Вялікабрытаніі, Галандыі, ЗША, Канадзе, Германіі, Чэхіі.

Нягледзячы на амаль стогадовую гісторыю існавання беларускіх асяродкаў у замежжы, яны дагэтуль застаюцца мала вывучанымі: існуюць толькі чатыры грунтоўныя працы, прысвечаныя жыццю беларускай дыяспары ў асобных краінах, – “Беларусы ў ЗША” В. Кіпеля, “Беларусы ў Аўстраліі”, “Беларусы ў Вялікабрытаніі” Н. Гардзіенкі, “Беларусы ў Канадзе” Я. Садоўскага (на англійскай мове). Навукоўцамі ў накірунку даследавання беларускай дыяспары ў Літве былі асветлены асобныя тэмы. На сённяшні дзень адсутнічае праца, прысвечаная этналагічнаму даследаванню беларусаў у літоўскай дзяржаве. Мэта дадзенай працы – аналітычны агляд прац беларускіх, літоўскіх, польскіх гісторыкаў, якія ў той ці іншай ступені датычаць вывучаемай тэмы.

Храналагічныя межы даследавання – канец XIX ст. – пачатак XXI ст. Ніжняя мяжа абумоўлена і супадае з этапам фарміравання нацыянальнай ідэі беларусаў і літоўцаў, верхняя – сучаснасць – перыяд існавання незалежных дзяржаў, калі беларусы ў Літве з’яўляюцца адной з этнічных меншасцей. Тэрыторыя даследавання – сучасныя межы Літоўскай дзяржавы, якія змяняліся на працягу даследуемага перыяду. У канцы XIX ст. літоўскія і этнічнабеларускія тэрыторыі ўваходзілі ў склад Расійскай імперыі. У выніку Першай сусветнай і Польска-савецкай войнаў тэрыторыя Літвы была падзелена на дзве часткі: заходнюю – утворана Літоўская рэспубліка са сталіцай у Коўна, усходнюю – Віленскае ваяводства, якое з’яўлялася адміністрацыйнай адзінкай II Рэчы Паспалітай. (Неабходна агаварыць, што маецца на ўвазе падзел на Заходнюю і Усходнюю Літву ў сённяшнім разглядзе карты літоўскай краіны. У той час Віленшчына – этнічна-беларускія землі, якія пасля Польска-савецкай вайны ўвайшлі ў склад польскай дзяржавы). З пачаткам Другой сусветнай вайны спыняе сваё існаванне II Рэч Паспалітая, а згодна тэксту Дамовы аб перадачы Літоўскай рэспубліцы горада Вільня і Віленскай вобласці і аб узаемадапамозе паміж Савецкім Саюзам і Літвой ад 10 кастрычніка 1939 г. частка паўднёва-усходняй Літвы і Вільня былі перададзены Літве. З 1939 г. па 1990 г. Літва ўваходзіла ў склад Савецкага саюза – Літоўская Савецкая Сацыялістычная рэс-публіка. У 1990 г. пачынаецца новы этап у гісторыі Літвы – незалежнай дзяржавы.

Існаванне кожнай з вышэйпералічаных дзяржаў і інстытутаў ставіла свае мэты ў адносінах да этнічных меншасцей, што знайшло адлюстраванне ў працах навукоўцаў канца XIX – пачатку XXI стст. Асвятленне пытання пражывання беларусаў на тэрыторыі сучаснай Літвы мае сваю гісторыю і падзя-

ляецца на тры перыяды: 1. Працы навукоўцаў канца XIX – першай паловы 1940-х гг. 2. Выданні другой паловы 1940-х – першай паловы 1980-х гг. 3. Сучасныя даследаванні.

Першы перыяд храналагічна супадае з этапам фарміравання беларускай нацыянальнай ідэі і ўсведамлення беларусаў як этнічнай групы ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Неабходна адзначыць, што працы навукоўцаў канца XIX – пачатку XX ст., якія былі накіраваны на вывучэнне беларусаў, сталі доказам існавання асобнага беларускага этнасу насуперак афіцыйным установкам русіфікацыі і адзінства народаў Расійскай імперыі. У дадзеным накірунку важнае месца займаюць працы даследчыкаў: А. Кіркора [2], Я. Карскага [3]. Пытанням заняткаў беларусаў прысвечана праца Ю. Янушэўскага "Premysł ludowy na Litwe i Bialorusi – a gdzieindziej", якая выйшла ў 1913 г. у Вільні [4]. У навуковы ўжытак былі ўведзены значныя і каштоўныя этнаграфічна-фальклорныя і лінгвістычныя матэрыялы, былі зафіксаваны асаблівасці побыту і духоўнага жыцця беларускага народа, і, незалежна ад суб'ектыўнай пазіцыі аўтара публікацыі, сведчалі аб арыгінальнасці і самастойнасці беларускага этнасу.

Гістарычныя падзеі першай чвэрці XX ст. мелі свой адбітак у працах навукоўцаў. Так, у часы Першай сусветнай вайны, калі кайзераўскія войскі акупавалі частку нашай краіны, адбыліся значныя змены ў жыцці краю. З боку нямецкай грамадскасці ўзрасла цікавасць да беларускай культуры. Пасля многіх стагоддзяў забароны, нарэшце афіцыйна была прызнана беларуская мова (1916), адкрыты першыя беларускія школы, праводзілася значная культурна-асветная работа. Нягледзячы на жорсткі акупацыйны рэжым, немцы ў многім садзейнічалі не толькі далучэнню беларусаў да цывілізаваных асноў еўрапейскага жыцця, але і ў пэўнай ступені спрыялі развіццю беларускай культуры і нацыянальнай самасвядомасці [5, с. 196]. Навукоўцы ў сваіх працах звярнулі ўвагу на асаблівасці гістарычнага шляху беларусаў і развіццё культуры. Манаграфія В. Егера "Беларусь" [6] – першая на нямецкай мове кніга, цалкам прысвечаная беларускаму краю і яго народу. У сваёй працы даследчык робіць спробу сістэматызаваць і абагульніць разрозненыя звесткі пра Беларусь, паказаць жыццё насельніцтва ў эканамічным, палітычным і сацыяльным аспектах. У працы А. Іпеля "Вільна – Менск. Старасветчына і мастацтва" [7] апісаны шматлікія творы беларускага мастацтва. Навуковец першы ўводзіць у навуковы зварот тэрмін: "беларускае мастацтва".

У выніку Першай сусветнай вайны адбыліся змены на карце Еўропы. Сталі незалежнымі дзяржавы – Літоўская і Польская рэспублікі. Польска-савецкая вайна стала прычынай падзелу тэрыторыі Беларусі на дзве часткі: Усходнюю і Заходнюю. Заходняя Беларусь была далучана да II Рэчы Паспалітай. Дзейнасць польскіх навукоўцаў была накіравана на вывучэнне далучаных да II Рэчы Паспалітай тэрыторый Заходняй Беларусі. Значнай працай у гэтым накірунку з'яўляецца кніга С. Веслоўха "Stosunki narodowościowe na terenie województw wschodnich" [8], у якой аўтар разглядае праблему польска-беларускіх узаемаадносін і падкрэслівае, што кіраўнікі II Рэчы Паспалітай былі зацікаўлены і шукалі магчымасць палепшыць міжэтнічныя ўзаемаадносіны як гарантыю стабільнасці краіны.

Пытанне знаходжання Заходняй Беларусі ў складзе Польскай дзяржавы мела сваё адлюстраванне і ў савецкай гістарыяграфіі міжваеннага перыяду: з сярэдзіны 20-х гадоў XX ст. савецкія гісторыкі прысвячалі свае працы становішчу беларускага насельніцтва ў складзе Польшчы. Даследаваннямі эканамічнага, сацыяльнага, палітычнага становішча займалася камісія АН БССР па вывучэнню Заходняй Беларусі, а таксама Інстытут польскай пралетарскай культуры. Неабходна адзначыць, што дадзеныя працы мелі больш прапагандысцкі характар, чым навуковы. У якасці прыкладу можна прывесці працы П. Гарбацэвіча "Паланізацыя Заходняй Беларусі" [9], П. Гака "Аграрная палітыка польскай буржуазіі ў Заходняй Беларусі" [10]. Аўтары гэтых прац прытрымліваліся пункту гледжання, што нацыянальная палітыка Польшчы – фашызм з усімі яго негатыўнымі праявамі, а менавіта: паланізацыяй прыцясненнем правоў працоўных мас і замацаваннем крывавай акупацыі для далейшай імперыялістычнай экспансіі на Усход.

Жыццю беларусаў у Літоўскай рэспубліцы прысвечана праца К. Езавітава "Беларусы ў Літве", якая пабачыла свет у 1932 г. у Рызе. У працы былі разгледжаны розныя бакі існавання беларусаў у 1920-х – пач. 1930-х гг. у Літве [11]. На думку аўтара, адной з праблем беларускай грамадскасці ў Літоўскай дзяржаве з'яўлялася "адсутнасць беларускай школы і культурна-асветнай арганізацыі, што ў сваю чаргу прыводзіць да павелічэння лічбы польскай і расейскай меншасці за кошт беларускай люднасці, а гэта адчыняе дарогу да палітычных уплываў, гістарычна варожых не толькі ідэі беларускага нацыянальнага адраджэння, але і самому існаванню незалежнай Літоўскай рэспублікі" [11, с. 4].

На працягу першых чатырох дзесяцігоддзяў пасля заканчэння Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў гістарыяграфічная літаратура ў Беларускай ССР была непасрэдна падпарадкавана ідэалагічным партыйна-савецкім мэтам. Ва ўмовах высокацэнтралізаванай савецкай дзяржавы – Саюза ССР тон і накіраванасць гістарычных даследаванняў задавала саюзная гістарыяграфія. Менавіта яна канкрэтызавала партыйныя ўказанні аб змесце і ацэнках асноўных падзей. Пры гэтым вялікая ўвага надавалася адпаведнасці такім падыходам гістарычнай літаратуры ў саюзных рэспубліках.

Асобных прац, прысвечаных жыццю беларусаў у Літве, да 1980-х гадоў не было. У выніку палітычнай "адлігі" гісторыкі атрымалі большы доступ да архіўных матэрыялаў. Але ў той самы час змены ў гістарыяграфіі былі мінімальнымі, таму што галоўнай функцыяй гістарычнай навукі засталася ідэалагічная.

Даследчыкі звярнулі сваю ўвагу на пытанне знаходжання Заходняй Беларусі ў складзе Польскай рэспублікі. А.А. Сарокін у сваёй манаграфіі "Аграрнае пытанне ў Заходняй Беларусі. 1920–1939 гг." разгледзіў развіццё сельскай гаспадаркі ў Заходняй Беларусі ў адзначаны час, падрабязна апісаў эканамічнае становішча заходнебеларускай вёскі [12].

Развіццё сельскай гаспадаркі Заходняй Беларусі разглядаецца ў працы Я.Б. Кухарава "Сельская гаспадарка Заходняй Беларусі 1919–1939гг.", у якой аўтар шмат увагі адвёў правядзенню рэформы ў Заходняй Беларусі, паказаў мэты правядзення, вынікі і значэнне рэформы для заходнебеларускага сялянства [13].

Гісторык І.В. Палуян у сваёй кнізе "Заходняя Беларусь у перыяд эканамічнага крызісу 1929–1933 гг." даследаваў негатыўны ўплыў эканамічнага крызісу на правядзенне аграрнай рэформы на землях Заходняй Беларусі, разгледзеў працэс маёмаснай дыферэнцыяцыі мясцовага сялянства [14].

Канфесійная гісторыя ў савецкі час не была папулярнай, адпаведна ідэалагічным устаноўкам рэлігія магла адыгрываць толькі негатыўную ролю ў гісторыі беларускага народа, а канфесіянальная палітыка разглядалася з пазіцый атэізму. Духоўныя інстытуты лічыліся інструментамі і сродкамі, якія выкарыстоўваў пануючы клас для правядзення карыснай для сябе палітыкі класавага і нацыянальнага ўціску. Барацьбе працоўных супраць "клерыкалізму" прысвечана манаграфія Я. Мараша "Палітыка Ватыкана і каталіцкай царквы ў Заходняй Беларусі" [15].

Вышэйпералічаныя працы савецкіх даследчыкаў даюць агульную інфармацыю пра сацыяльна-эканамічнае, духоўнае становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы, але, пакідаючы па-за ўвагай ідэалагічны аспект, з'яўляюцца вартымі для даследавання гісторыі беларусаў Віленшчыны ў складзе Польскай дзяржавы ў міжваенны перыяд з улікам вылучаных навукоўцамі эканамічных, сацыяльных праблем.

У 1982 г. выйшла калектыўная праца літоўскіх і беларускіх навукоўцаў "Lietuva ir Baltarusija Bendradarbiavimas brandas socializmo metais" на літоўскай мове, а ў 1985 г. на рускай "Белоруссия-Литва: содружество множит силы" [16; 29]. Выданні выконвалі ідэалагічную функцыю, але даныя ў галіне развіцця сельскай гаспадаркі, будаўніцтва, навукі і культуры, якія ўтрымліваюцца ў гэтых працах карысныя для вывучэння.

Новая хваля працэсу этнічнай мабілізацыі беларускай дыяспары ў Літве – другая палова 1980-х – звязана з палітыкай перабудовы. У БССР, як і ва ўсім Савецкім Саюзе, пачалі заўважацца пэўныя прыкметы лібералізацыі і дэструкцыі савецкага грамадства. З пачатку 1990-х, калі Беларусь абвясціла незалежнасць, а беларускае нацыянальнае адраджэнне набірала моц, з'явіліся публікацыі навукоўцаў, у якіх з новых пазіцый асэнсоўвалася гісторыя беларускага замежжа. Упершыню ў незалежнай Беларусі тэма беларускай дыяспары пачала ўлучацца ў гістарычны кантэкст развіцця беларусаў у абагульняльнай працы "Нарысы гісторыі Беларусі" [17, с. 309]. Пытанням беларускага замежжа прысвечана праца Г. Сяргеевай "Беларуская дыяспара ў нацыянальнай гістарыяграфіі ХХ стагоддзя", у якой аўтарка разглядае міграцыйныя працэсы беларускага насельніцтва ў ХХ стагоддзі, вылучаючы характэрныя асаблівасці асвятлення гэтага працэсу ў працах беларускіх навукоўцаў як на радзіме, так і ў замежжы [18]. Беларускім дзяржаўным універсітэтам выдадзена спецыяльная навучальная праграма "Беларуская дыяспара", у якой асвятляюцца пытанні беларускага замежжа, асноўныя накірункі міграцыі беларусаў, гісторыя і сучаснае становішча беларускіх этнічных груп у розных краінах [19].

Пытанні жыцця беларусаў па-за метраполіяй асветлены ў зборніках навуковых артыкулаў, у айчынным і замежным друку. Так, у 1994 г. выйшаў зборнік "Нацыянальныя і рэгіянальныя культуры, іх узаемадзеянне" пад рэдакцыяй А. Мальдзіса. Інфарматыўнымі ў накірунку даследавання беларусаў у Літве з'яўляюцца артыкулы В. Мыслэка "Беларускае пытанне ў каталіцкай публіцыстыцы ІІ Рэчы Паспалітай" [20], І. Коўкеля "Польска-літоўскі канфлікт і роля ў ім беларускіх палітычных партыяў і арганізацыяў (1920–1923 гг.)" [21], А. Цітова "Беларускі дэпутацкі клуб і праблема аграрнай рэформы ў польскім сейме ў 1922–1925 гг" [22], Э. Зайкоўскага "Вільня і беларускі космас" [23], у якіх асветлены розныя бакі жыцця беларусаў у міжваенны перыяд. У сваёй працы В. Мыслэк разглядае беларускае пытанне ў каталіцкай публіцыстыцы ІІ Рэчы Паспалітай. Аўтар звяртае ўвагу на тое, што ў вывучаемым матэрыяле, які ахоплівае некалькі дзесяткаў назваў каталіцкіх выданняў, увогуле не сустракаюцца публікацыі, прысвечаныя цалкам беларускім справам. Пазіцыю гэтых часопісаў і газет можна рэканструяваць, абапіраючыся на фрагментарныя, часта выпадковыя выказванні [24, с. 251].

Польска-літоўскі канфлікт 1920–1923 гг. прааналізаваны ў працы І. Коўкеля. Аўтар разглядае палітычныя падзеі вызначанага перыяду і вырашэнне спрэчак паміж Польшчай і Літвой за землі Віленшчыны і Гродзеншчыны. На спрэчнай тэрыторыі пражывала значная колькасць насельніцтва беларускай нацыянальнасці – 40 працэнтаў ад агульнай колькасці. Для вырашэння тэрытарыяльнага пытання

Літва і Польшча імкнуліся заручыцца падтрымкай беларускіх палітычных партый і арганізацый. Перамовы паміж дзвюмя дзяржавамі, якія кантраляваліся Лігай Нацый, былі безвыніковымі, што для апошняй стала аргументам для выхаду і перадачы вырашэння тэрытарыяльнага пытання ўрадам Літвы і Польшчы. Гэты факт быў выкарыстаны польскім урадам і ў хуткім часе яму ўдалося паказаць, што не толькі Віленшчына і Гродзеншчына "жадае" жыць пад уладай ІІ Рэчы Паспалітай, а і ўся Заходняя Беларусь. У сакавіку 1922 г. на тэрыторыі Сярэдняй Літвы было створана Віленскае ваяводства. Адным з фактараў, які быў выкарыстаны польскімі ўладамі – адсутнасць адзінства паміж беларускімі палітычнымі сіламі [21, с. 266].

У артыкуле А. Цітовай аналізуецца аграрная праблема, якая цесна перапляталася з нацыянальнай. У сваёй працы аўтарка прыходзіць да высновы, што сутнасць разглядаемай праблемы заключаецца ў эвалюцыі на працягу двух з паловай гадоў – ад лаяльнасці ў дачыненні да польскага грамадства і дзяржавы да апазіцыі з ёй. Значная доля адказнасці за гэта самімі прадстаўнікамі беларускага народа ў сейме ўскладвалася не толькі на польскіх нацыяналістаў, але і на польскую дэмакратыю, якая не здолела перамагчы нацыяналістычныя прымхі [22, с. 276].

Э. Зайкоўскі ў сваёй працы разглядае пытанне заснавання Вільні і паходжанне яе старажытных насельнікаў. Аўтар на падставе аналізу матэрыялаў легенд і сведчанняў летапісаў прыходзіць да высновы, што "вобраз Хрыстафора (гарадскі герб г. Вільні з пачатку XVI ст.) выклікае асацыяцыі з чалавекам-сабакам, чалавекам-ваўком, якім у сярэдневяковым фальклоры паўстае Усяслаў. На аснове гэтага ж фальклору з'явілася легенда пра жалезнага ваўка на Крывой гары, якога сасніў Гедымін. Назва гары мае падабенства як з этнонімам крывічоў, так і з імем легендарнага першасвятара Крывэ-Крывейтэ" [23, с. 425].

У 2001 г. выйшаў зборнік "Беларуская дыяспара як пасрэдніца цывілізацый" [25]. Пытанням гісторыі беларускай дыяспары ў Літве прысвечаны артыкул В. Гапоненка "Навуковая эліта беларускай дыяспары: адметныя рысы і асаблівасці вывучэння" [26]. В. Гапоненка ў сваёй працы разглядае пытанні міграцыі беларускага насельніцтва: з канца XIX – пачатку XX ст. пачаўся працэс фарміравання дыяспары як сталага месца пражывання значнай часткі беларускага народа за межамі Бацькаўшчыны [26, с. 5]. У сваёй працы аўтарка на прыкладзе асобных постацей вучоных розных галінаў ведаў зрабіла спробу выявіць агульныя і адметныя рысы ў іх навуковым і жыццёвым лёсе.

Мова газет Балтыі аналізуецца ў працы С. Прохаравай, Ю. Гурскай "Мова беларускага друку ў краінах Балтыі" [27]. На падставе аналізу газет, навукоўцы акрэслілі асноўную мэту – "разбурэнне стэрэатыпаў беларуса і Беларусі, якія ствараліся шмат гадоў. Сутнасць іх у тым, што нібыта да рэвалюцыі 1917 г. Беларусь была малапісьменнай краінай, не мела ні дзяржаўнай мовы, ні дзяржавы, ні культуры" [27, с. 27]. Падсумоўваючы прааналізаваны матэрыял перыядычных выданняў, аўтары прыходзяць да высноў, што можна выявіць агульныя тэндэнцыі ў выкарыстанні асабовых імёнаў газетамі Балтыі. З аднаго боку, гэта – разбурэнне стэрыятыпаў, створаных вакол імёнаў, а з другога – выяўленне беларусаў, якія змаглі рэалізаваць свае таленты толькі за межамі Беларусі [27, с. 34]. На думку навукоўцаў, зварот перыядычных выданняў да "тарашкевіцы" як да больш культурнай, па меркаванню выдаўцоў, традыцыі дала ўзоры для далейшай распрацоўкі кадыфікаванай беларускай мовы.

Каштоўнасць уяўляе зборнік "Дыяспара. Культуралогія. Гісторыя" пад рэдакцыяй А. Мальдзіса. У сваёй працы "З гісторыі беларускай дыяспары ў Літве" А. Ціхаміраў разглядае гісторыю ўзаемадзеяння паміж беларусамі і літоўцамі з XIII ст. да 1991 г., выдзяляюцца характэрныя асаблівасці для кожнага з перыядаў існавання двух этнасаў [28]. Аналізуюцца стасункі ў часы Вялікага княства, паказваецца галоўная роля Вільні як палітычнага і духоўнага цэнтра беларусаў і літоўцаў. Увага навукоўца звернута да ажыўлення нацыянальнага пытання як літоўцаў, так і беларусаў на пачатку XX ст. На думку аўтара, беларусы, якія ў перыяд паміж 1920 і 1939 гг. пражывалі ў межах літоўскай дзяржавы, уяўлялі сабой класічную дыяспару, бо знаходзіліся на этнічна літоўскіх землях. Разглядаецца беларускае жыццё ў Каўнасе ў міжваенны перыяд. Аналізуецца спроба стварэння агульнай арганізацыі для беларусаў у 1933 г. і прычыны няўдачы. У 1950-я гг. пачынаецца перасяленне беларусаў у гарады Літвы, значна павялічваецца колькасць беларускага насельніцтва ў краіне. Аднак павелічэнне кольскасці беларусаў не прывяло да ажыўлення беларускага нацыянальнага жыцця ў Літве. Новы перыяд пачынаецца ў другой палове 80-х гг., у 1988 г. узнікла першая беларуская нацыянальна-асветная арганізацыя – таварыства "Сябрына" і хор "Сябрына". Змяняецца становішча беларусаў пасля абвяшчэння незалежнасці Літвы і яе выхаду са складу СССР.

Артыкул А. Вашкевіча "Віленская газета "Беларускі фронт" і праблема поліэтнічнага выбару беларусаў у другой палове 1930-х гадоў" дае інфармацыю пра дзейнасць незалежнага ад тагачасных "гаспадароў становішча" выдання, якое прапагандавала беларускую ідэю [29]. На думку А. Вабішчэвіча, рэдакцыя "Беларускага фронту" была адзінай беларускай групоўкай, якая сустрэла пачатак Другой сусветнай вайны з акрэсленай ідэалагічнай пазіцыяй.

А. Глагоўская ў артыкуле "Беларуская інтэлігенцыя ў міжваеннай Вільні" звяртае ўвагу на асаблівасці жыцця беларусаў у міжваенны перыяд, палітыку Польшчы ў адносінах да нацыянальных меншасцей і дзейнасць беларускай эліты на ніве беларускай культуры і палітыкі, нягледзячы на цяжкасці [30].

Еўрапейскія перасяленчыя працэсы 30–50-х гг XX ст., у якія тройчы былі ўцягнуты беларускія землі, разгледжаны ў артыкуле А. Вялікага “Беларусь у еўрапейскіх перасяленчых працэсах 30–50-х гг. XX стагоддзя” [31]. Аўтар прыходзіць да высновы, што акрэсленыя працэсы праходзілі ва ўмовах складаных міжнародныхй абставін, калі розныя палітычныя сілы разглядалі заходнебеларускі рэгіён і яго насельніцтва як аб’ект сваіх геапалітычных інтарэсаў. Вынікам перасяленчых акцый стаў масавы зыход насельніцтва з заходняга рэгіёна Беларусі.

Беларуска-літоўскім узаемаадносінам у 1915–1924 гг. прысвечана кандыдацкая дысертацыя С.В. Багалейша [32; 33]. У 2014 г. выходзіць манаграфія па дадзенай тэматыцы [33], у якой С.В. Багалейша асвятляе нацыянальна-дзяржаўныя пытанні дзвюх краін і прыходзіць да высновы, што больш спрыяльныя ўмовы склаліся для Літвы. БНР, якая знаходзілася ў стадыі фарміравання, па прычыне вонкавых і ўнутраных абставін не здолела адстаяць сваю незалежнасць [32, с. 16].

Пытанні ўзаемаадносін паміж Літоўскай і Беларускай дзяржавай на сучаным этапе асветлены ў працах А. Ціхамірава “Белорусско-литовские отношения в 2007–2008 гг.” [34], А. Валодзькіна “Аналіз беларуска-літоўскіх палітычных кантактаў у 2001–2010 гг.” [35], Д. Пінькевіч “Пытанне правоў нацыянальных меншасцяў на парламенцкіх выбарах у Літве 2012 г.” [36].

Асобную групу складаюць працы польскіх навукоўцаў. Пытанні памежжа даследуюцца ў працах польскіх даследчыкаў. Вынікі даследаванняў былі асветлены падчас міжнародных канферэнцый у 1995, 1998, 2000 гг. [57]. Міжваенны перыяд выклікае асаблівую цікаўнасць, сярод навуковых даследаванняў грунтоўнасцю вылучаюцца працы А. Бергман “Sprawy bialoruskie w II Rzeczypospolitej”, Р. Дзванкоўскі “Polacy na dawnych kresach wscodnich. Z problematyki narodowosciowej i religijnej”, В. Слешынскі “Bezpieczeństwo wewnętrzne w polityce państwa polskiego na ziemiach północno-wschodnich II Rzeczypospolitej” і “Swiat pogranicza” [38; 39; 40; 41]. Цікавасць прадстаўляе манаграфія польскай даследчыцы Я. Садоўскай “Ku szkole na miarę Drugiej Rzeczypospolitej”, у якой разглядаюцца пытанні арганізацыі адукацыі, школьныя праграмы розных ступеняў і накірункаў навучання (пачатковых школ, гім-назій, ліцэяў, прыхадскіх школ, школ пры фабрыках і заводах) [42]. Пытанню прымусовай працы ў часы III Рэйха прысвечана праца В. Міял “Akta osobowe cudzoziemskich rabotników przymusowych w zespole Prezydium Policji w Szczecinie (Polizeipräsidium in Stettin) – Białorusini, Estończyncy, Litwini, Łotysze, Polacy i Rosjane na Pomorzu Zachodnim w latach 1939–1945” [43]. У даследаваннях польскіх даследчыкаў разгледжаны розныя аспекты жыцця беларусаў на тэрыторыі сучаснай Літвы – эканамічныя, палітычныя, культурныя і інш.

Вывучэннем жыцця беларусаў на тэрыторыі сучаснай Літвы займаюцца і самі прадстаўнікі беларускай дыяспары. Так, міжваеннаму перыяду прысвечана праца А. Адамковіча “Беларусы ў Літве: учора і сёння” [1]. Манаграфія падзелана на дзве часткі. У першай частцы аўтар разглядае Віленшчыну ў міжваенны перыяд (1921–1939 гг): развіццё беларускай школьнай справы, перыядычныя выданні, дзейнасць Беларускага пасольскага клуба, у другой размешчаны інтэрв’ю з беларусамі Вільні.

Артыкул Л. Мурашка “Беларуская прысутнасць у Літве” дае інфармацыю пра сучаснае становішча беларусаў у Літоўскай дзяржаве. Разглядаюцца сацыяльна-палітычны, культурны, адукацыйны аспекты. Аўтар прыходзіць да высновы, што беларуская супольнасць інтэгруецца ў дэмакратычную грамадскасць Літвы, але не асімілюецца [45].

Адной з даследчыц беларускай супольнасці ў Літве на сучасным этапе з’яўлаецца Л. Плыгаўка. Навукоўца у сваіх працах аналізуе пытанні з’явы моўнай і культурнай інтэрферэнцыі, абмяркоўвае праблемы ўплыву беларускай культуры на агульную культурную сітуацыю ў Літве [46; 47; 48; 49,50].

У 2009 г. выйшла манаграфія Л. Плагыўка “Kalba ir tarpkultūririe komunikacija” [51]. На шырокім коле апублікаваных матэрыялаў, палявых запісаў было даследавана пытанне лінгвістычных узаемадачыненняў паміж прадстаўнікамі розных нацыянальнасцей Паўднёва-ўсходняй тэрыторыі Літоўскай рэспублікі. Даследаванне паказала агульнасць і спецыфіку з’яў у беларускай мове ў Літве ў параўнанні з мовай метраполіі: яе стан характарызуецца супадзеннем працэсаў, што адбываюцца ў беларускай нарматыўнай мове, так і яе рэгіянальнымі асаблівасцямі, абумоўленымі моўнымі кантактамі на тэрыторыі Віленшчыны, моўнай здольнасцю і ствараемымі тэкстамі, а не самой моўнай сістэмай. Аўтарка ўказвае, што беларускі ўплыў на іншыя мовы даследуемага рэгіёну выяўляецца досыць актыўна і паслядоўна, у першую чаргу ў лексічным масіве як найбольш адкрытай і рухомай сістэме [51, с. 228].

У серыі “Партрэты віленчукоў” Беларускага выдавецтва ў Літве у канцы 1990-х – пачатку 2000-х гг. выйшлі кнігі пра знакамітых палітычных і грамадскіх дзеячоў у эміграцыі, у якіх падаюцца сапраўдныя, ачышчаныя ад беспадстаўных закідаў постаці знаных беларусаў – А. Уласава [52], Л. Луцкевіча [53], З. Верас [54], Я. Шутовіча [55], Ст. Станкевіча [56], А. Станкевіча [57], Н. Арсеньеву [58], А. Антановіча [59], А. Сакалову-Лекант [60]. Ініцыятарам стварэння “Партрэтаў віленчукоў” была пісьменніца Зоська Верас, якая пачала збіраць жыццяпісы заслужаных людзей беларускай культуры. Працягнулі яе працу Лявон Луцкевіч і Галіна Войцік.

Такім чынам, вылучаны тры перыяды даследавання беларускай дыяспары ў Літве. Для першага перыяду характэрным з'яўляецца назапашванне інфармацыі і атрыманне доказу існавання беларусаў, як асобнага этнасу. Неабходна выдзеліць працы навукоўцаў міжваеннага часу, польскіх, савецкіх і латышскіх, якія асвятлялі розныя бакі жыцця беларусаў на тэрыторыі сучаснай Літвы. Другі перыяд храналагічна супадае з часам існавання савецкай дзяржавы, калі вялікі ўплыў на гістарычную навуку аказвала дзяржаўная сістэма і яе патрабаванні. Трэці перыяд бярэ свой пачатак у другой палове 1980-х гг., калі адбываецца пераасэнсаванне і змена палітычнага курсу. Развіццё гістарычнай навукі ў незалежных дзяржавах дазволіла больш грунтоўна і змястоўна разгледзіць пытанні беларускага замежжа. У накірунку даследавання беларускай дыяспары ў Літве навукоўцамі асветлены сацыяльна-эканамічныя, палітычныя, культурныя, канфесійныя аспекты, пытанні моўнага і культурнага ўзаемаемадзення беларускага і літоўскага этнасаў.

ЛІТАРАТУРА


1. Коваль, В. Кантакты беларускай і украінскай дыяспар міжваеннага перыяду [Электронны рэсурс] / В. Коваль. – Рэжым доступу: https://docviewer.yandex.by/?url=ya-serp%3A%2F%2Fpdf.kamunikat.org%2F13178-10.pdf&lang=be&c=55606669feb7. – Дата доступу: 03.05.2015.
2. Киркор, А. Этнографический взгляд на Виленскую губернию / А. Киркор // Этнографический сборник Императорского Русского географического общества. Вып. 3. – СПб., 1858. – С. 115–276.
3. Карский, Е. Ф. К вопросу об этнографической карте белорусского племени / Е. Ф. Карский. – СПб., 1902. – 16 с.
4. Januszewski, J. Premysł ludowy na Litwe i Bialorusi – a gdzieindziej / J. Januszewski. – Wilno : Znicz, 1913. – 16 s.
5. Сакалоўскі, У. Успрыняцце беларускай культуры ў Германіі ў 1875–1918 гг. / У. Сакалоўскі // Дыяспара. Культуралогія. Гісторыя / пад рэд. А. Мальдзіса, А. Смаленчука. – Мінск : Голас Радзімы, 2006. – С. 193–200.
6. Jäger, W. Weissruthenien, Land, Bewohner / W. Jäger // K. Curtius. – 1919. – 143 s.
7. Ippel, A. Wilna – Minsk, Altertümer und Kunstgewerbe : Führer durch die Ausstellung der Zeitung der 10. Armee / bearb. von A. Ippel. – Wilna : Zeitung der 10. Armee, 1918. – 40 s.
8. Wysłouch, S. Stosunki narodowościowe na terenie województw wschodnich / S. Wysłouch. – Warszawa, 2013. – 331 s.
9. Гарбацэвіч, П. Паланізацыя Заходняй Беларусі / П. Гарбацэвіч ; Бел. акад. навук. Каміс. Заход. Беларусі. – Мінск,1932. – 23 с.
10. Гак, П. Аграрная палітыка польскай буржуазіі ў Заходняй Беларусі / П. Гак ; Ін-т гісторыі Кастрычніцкай рэвалюцыі пры ЦК КП(б)Б. – Мінск : Дзярж. выд-ва Беларусі. Партмассектар, 1933. – 93 с.
11. Езавітаў, К. Беларусы ў Літве / К. Езавітаў. – Рыга : Выд. Беларус. выд-ва ў Латвіі, 1932. – 16 с.
12. Сорокин, А. А. Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920–1939 гг) / А. А. Сорокин. – Минск : Наука и техника, 1968. – 204 с.
13. Кухарев, Б. Е. Сельское хозяйство Западной Белоруссии (1919–1939 гг.) / Б. Е. Кухарев ; под науч. ред. проф. И. Н. Шемякина. – Минск : Вышэш. школа, 1975. – 112 с.
14. Полуян, И. В. Западная Белоруссия в период экономического кризиса 1929–1933 гг. / И. В. Полуян ; под ред. М. П. Костюка – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – 207 с.
15. Мараш, Я. Н. Политика Ватикана и католической церкви в Западной Белоруссии (1918–1939) / Я. Н. Мараш. – Минск : Беларусь, 1983. – 96 с.
16. Strumskis, K. Lietuva ir Baltarusija Bendradarbiavimas brandas socializmo metais / K. Strumskis, I. Marčenka, G. Meljankovas. – V. Mokslas, 1982. – 180 p.
17. Сяргеева, Г. Г. Замежныя сувязі: набыткі і пралікі / Г. Г. Сяргеева // Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. / М. П. Касцюк [і інш.] ; Ін-т гісторыі АНБ. – Мінск : Беларусь, 1995. – Ч. 2. – С. 409–420.
18. Сяргеева, Г. Беларуская дыяспара ў нацыянальнай гістарыяграфіі ХХ стагоддзя / Г. Сяргеева // Беларускі ін-т навукі і мастцтва. –Запісы, № 25. – New York – Miensk, 2001. – С. 5–40.
19. Беларуская дыяспара / Беларускі дзярж. ун-т; Факультэт міжнародных адносін. – Мінск : Трыалета, 2006. – 158 с.
20. Мыслэк, В. Беларускае пытанне ў каталіцкай публіцыстыцы ІІ Рэчы Паспалітай / В. Мыслэк // Нацыянальныя і рэгіянальныя культуры, іх узаемадзеянне / рэд. А. Мальдзіс [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – 431 с.
21. Коўкель, І. Польска-літоўскі канфлікт і роля ў ім беларускіх палітычных партыяў і арганізацыяў / І. Коўкель // Нацыянальныя і рэгіянальныя культуры, іх узаемадзеянне / рэд. А. Мальдзіс [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – 431 с.
22. Цітова, А. Беларускі дэпутацкі клуб і праблема аграрнай рэформы ў польскім сейме ў 1922–1925 гг. / А. Цітова.
23. Зайкоўскі, Э. Вільня і беларускі космас / Э. Зайкоўскі // Нацыянальныя і рэгіянальныя культуры, іх узаемадзеянне / рэд. А. Мальдзіс [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – С. 420–426.
24. Мыслэк, В. Беларускае пытанне ў каталіцкай публіцыстыцы ІІ Рэчы Паспалітай / В. Мыслэк // Нацыянальныя і рэгіянальныя культуры, іх узаемадзеянне / рэд. А. Мальдзіс [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – 431 с.
25. Беларуская дыяспара як пасрэдніца цывілізацый / уклад. Т. Пятровіч. – Мінск : МГА "Бел. кнігазбор", 2001. – 308 с.

26. Гапоненка, В. Навуковая эліта беларускай дыяспары: адметныя рысы і асаблівасці вывучэння / В. Гапоненка // Беларуская дыяспара як пасрэдніца цывілізацый / уклад. Т. Пятровіч. – Мінск : МГА "Бел. кнігазбор", 2001. – С. 5–16.
27. Прохарава, С. Мова беларускага друку ў краінах Балтыі / С. Прохарава, Ю. Гурская / Беларуская дыяспара як пасрэдніца цывілізацый / уклад. Т. Пятровіч. – Мінск : МГА "Бел. кнігазбор", 2001. – С. 27–34.
28. Ціхаміраў, А. З гісторыі беларускай дыяспары ў Літве// Дыяспара. Культуралогія. Гісторыя / пад рэд. А. Мальдзіса, А. Смаленчука. – Мінск : Голас Радзімы, 2006. – 359 с.
29. Вабішчэвіч, А. Віленская газета «Беларускі фронт» і праблема поліэтнічнага выбару беларусаў у другой палове 1930-х гадоў / А. Вабішчэвіч // Дыяспара. Культуралогія. Гісторыя / пад рэд. А. Мальдзіса, А. Смаленчука. – Мінск : Голас Радзімы, 2006. – 359 с.
30. Глагоўская, А. Беларуская інтэлігенцыя ў міжваеннай Вільні / А. Глагоўская // Дыяспара. Культуралогія. Гісторыя / пад рэд. А. Мальдзіса, А. Смаленчука. – Мінск : Голас Радзімы, 2006. – С. 329–336.
31. Мыслэк, В. Беларускае пытанне ў каталіцкай публіцыстыцы ІІ Рэчы Паспалітай / В. Мыслэк // Нацыянальныя і рэгіянальныя культуры, іх узаемадзеянне / рэд. А. Мальдзіс [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – 431 с.
32. Багалейша, С. В. Беларуска-літоўскія ўзаемаадносіны ў 1915–1924 гг. / С. В. Багалейша. – Мінск : Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўнівесітэт, 2014. – 231 с.
33. Багалейша, С. В. Беларуска-літоўскія ўзаемаадносіны ў 1915–1924 гг. / Багалейша С. В. – Мінск, 2006. – 20 с.
34. Тихомиров, А. В. Белорусско-литовские отношения в 2007–2008 гг. / А. В. Тихомиров // Беларусь в современном мире : материалы VII Междунар. нуч. Конф., посвящ. 87-летию образования Бел. Гос. ун-та, Минск, 30 окт. 2008 г. / редкол.: В. Г. Шадурский. – Минск : Тесей, 2008. – С. 56–58.
35. Валодзькін, А. А. Аналіз беларуска-літоўскіх палітычных кантактаў у 2001–2010 гг. / А. А. Валодзькін // Беларусь у сучасным свеце : материалы XI Междунар. науч. конф., посвящ. 91-летию образования Бел. гос. ун-та, Минск, 30 окт. 2012 г. / редкол.: В. Г. Шадурский. – Минск : Изд. центр. БГУ, 2012. – С. 32–34.
36. Пінькевіч, Д. П. Пытанне правоў нацыянальных меншасцяў на парламенцкіх выбарах у Літве 2012 г. / Д. П. Пінькевіч // Беларусь у сучасным свеце : материалы XI Междунар. науч. конф., посвящ. 91-летию образования Белорус. гос. ун-та, Минск, 30 окт. 2012 г. / редкол.: В. Г. Шадурский. – Минск : Изд. центр. БГУ, 2012.– С. 55–57.
37. Pogranicza etniczne w Europie / Uniw. w Bialymstoku. Inst. Socjoligii. – Bialymstok : Wyd-wo Uniw. w Bialymstoku, 2001. – 382 s.
38. Bergman, A. Sprawy bialoruskie w II Rzeczypospolitej / A. Bergman. – Warszawa : Panstwowe wydawnictwo naukowe, 1984. – 287 s.
39. Dzwonkowski, R. Polacy na dawnych kresach wscodnich. Z problematyki narodowosciowej i religijnej / R. Dzwonkowski. – Lublin, 1994. – 150 s
40. Sleszynski, W. Bezpieczeństwo wewnetrzne w polityce państwa polskiego na ziemiach pólnocno-wschodnich II Rzeczypospolitej / W. Sleszynski. – Warszawa, 2007. – 406 s.
41. Sleszynski, W. Swiat pogranicza / W. Sleszynski. – Białystok : Instytut Historii Uniwersytetu w Białymstoku Kraków : Avalon, 2009–2010. – Cz. 1 : II Rzeczypospolita (1919 – 1939) ; Dwa pierwsze lata wojny (1939–1941). – 2009. – 216 s.
42. Sadowska, J. Ku szkole namiarę Drugiej Rzeczypospolitej / J. Sadowska. – Białystok, 2001. – 295 s.
43. Mijal, W. Akta osobowe cudzoziemskich rabotników przymusowych w zespole Prezydium Policji w Szczecinie (Polizeipräsidium in Stettin) – Białorusini, Estończyncy, Litwini, Łotysze, Polacy i Rosjane na Pomorzu Zachodnim w latach 1939 – 1945 / W. Mijal // Repatriacje i migracje ludnosci pogranicza w XX wieku / red. M. Kietlinski, W. Sleszynska. – Bialystok, 2004. – S. 76–89.
44. Адамковіч, А. Беларусы ў Літве: учора і сёння / А. Адамковіч. – Вільня : Таварыства беларускай культуры ў Літве, 2010. – Кніга І – Вільня. – 200 с.
45. Мурашка, Л. Беларуская прысутнасць у Літве / Л. Мурашка // Беларуская дыяспара як пасрэдніца цывілізацый / уклад. Т. Пятровіч. – Мінск : МГА "Бел. кнігазбор", 2001. – С. 84–86.
46. Плыгаўка, Л. Беларуска-літоўскія рэгіянальныя кантакты ў сістэме інтэрферэнтных з'яў полікультурнай зоны / Л. Плыгаўка – Мінск : Рэсп. ін-т выш. шк., 2001. – 39 с.
47. Плыгаўка, Л. Сацыялінгвістычная сітуацыя ў сучаснай Літве / Л. Плыгаўка // Slovenska-slovaskė jazykovė, literarne a kulturne vzt`ahy / Prešov: Prešovska univerzita v Prešove, Filozofiska fakulta, 2007. – С. 210–218.
48. Плыгаўка, Л. Універсітэцкі асяродак беларусістыкі ў Літве / Л. Плыгаўка // Беларуская дыяспара як пасрэдніца цывілізацый / уклад. Т. Пятровіч. – Мінск : МГА "Бел. кнігазбор", 2001. – С. 84–86.
49. Плыгаўка, Л. Л. Беларуская мова ў Літоўскай рэспубліцы: статус і сферы рэалізацыі / Л. Л. Плыгаўка // Весці БДПУ. Сер. 1, педагогіка, Філалогія. – Мінск : БДПУ, 2004. – С. 50–54.
50. Плыгаўка, Л. Л. Наша мова – без межаў. Беларуская мова ў сітуацыі моўных узаемакантактаў у Літве / Л. Л. Плыгаўка // Образование Минщины / управление образования Миноблисполкома, ГУО «Минский областной институт развития образования». – Минск : Белорусский Дом печати, 2005. – С. 47–50.
51. Kalba ir tarpkultūririe komunikacija / red. kol.: L. Plygavka. – Vilnius : Vilniaus pedagoginio universiteto leidykla, 2009. – 190 c.
52. Луцкевіч, Л. Аляксандр Уласаў / Л. Луцкевіч, Г. Войцік ; рэд.: А. Мінкін. – Вільня : "Рунь", 2001. – 17 с.
53. Войцік, Г. Лявон Лучкевіч / Г. Войцік ; рэд.: А. Мінкін. – Вільня : "Рунь", 1999. – 13 с.
54. Войцік, Г. Зоська Верас / Г. Войцік ; рэд.: А. Мінкін. – Вільня : "Рунь", 2002. – 25 с.

55. Луцкевіч, Л. Янка Шутовіч / Л. Луцкевіч, Г. Войцік ; рэд.: А. Мінкін. – Вільня : “Рунь”, 2000. – 14 с.
56. Русак, М. Лявонава доля / М. Русак ; рэд.: А. Мінкін. – Вільня : “Рунь”, 2000. – 105 с.
57. Луцкевіч, Л. Адам Станкевіч / Л. Луцкевіч, Г. Войцік ; рэд.: А. Мінкін. – Вільня : “Рунь”, 2002. – 23 с.
58. Войцік, Г. Наталля Арсеньева / Г. Войцік ; рэд.: А. Мінкін. – Вільня : “Рунь”, 2003. – 21 с.
59. Луцкевіч, Л. Антон Антановіч / Л. Луцкевіч, Г. Войцік ; рэд.: А. Мінкін. – Вільня : “Рунь”, 2002. – 19 с.
60. Войцік, Г. Алёна Сакалова-Лекант / Г. Войцік ; рэд.: А. Мінкін. – Вільня : “Рунь”, 2004. – 19 с.

*Пастуліў 28.09.2015*

## THE CENTER FOR THE BELARUSIAN CULTURE, LANGUAGE AND LITERATURE RESEARCHES OF THE NATIONAL ACADEMY OF SCIENCES OF BELARUS

***A. IZERHINA***

*The article deals with the analytical review of the researches by Belorussian, Lithuanian, Polish historians on the question of the studying the Belorussian diaspora in Lithuania. The author marks three chronological periods in the studying of the problem. The first period is characterized by accumulating information and proving the existence of the Belorussian in Lithuania as a specific ethnic group. Chronologically the second period coincides with the tome of the Soviet Union when the political system and its demands influenced on the historical science greatly. The third period began in the mid-1980s when the changes in the policy took place. The development of historical science in the independent countries gave the opportunity to analyze the question of the Belorussian expatriate community more properly. By studying the Belorussian expatriate community in Lithuania, social and economic, political and cultural, confessional aspects as well as the questions of language and cultural interaction of the Belorussian and the Lithuanian ethnic groups were analyzed.*

***Keywords**: diaspora, ethnic group, Belorussian expatriate community.*